ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# Гомельскі універсітэт

№ 9 (891) | Аўторак, 23 мая 1995г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная

*Прафарыентацыя*

## ВУЧОНЫЯ -- ШКОЛЕ

Зараз выпускнікі сярэдніх школ -- перад адказным выбарам: куды пайсці вучыцца, якой прафесіі аддаць перавагу? Многія з іх ужо змаглі з"арыентавацца, і дапамаглі ім гэта зрабіць створаныя ў школах спецыялізаваныя класы, дзе асобным прадметам удзяляецца прыярытэтная ўвага. Адной з такіх з"яўляецца і СШ N8 г.Гомеля, якую ўзначальвае выпускнік біяфака ГДУ С.А.Рыдзь. Тут вядзецца паглыбленае выкладанне хіміі, біялогіі. Многія яе вучні -- удзельнікі і пераможцы гарадскіх і абласных алімпіяд.

Днямі сюды прыйшлі выкладчыкі біялагічнага факультэта ГДУ, вучоныя з мединстытута, медыкі-практыкі горада, каб яшчэ больш шырока, паглыблена пазнаёміць выпускнікоў з навукай аб жывым. Размова з вучнямі насіла не толькі пазнавальны характар, але і расказвала аб тых выдатных магчымасцях, якія дае маладому чалавеку веданне біялогіі, экалогіі, бо яны вучаць жыць у гармоніі з прыродай, выпрацоўваюць культуру зносін людзей і навакольнага асяроддзя.

На сустрэчы абмяркоўваліся таксама формы далейшага ўзаемакарыснага супрацоўніцтва факультэта і школы, магчымае адкрыццё ў ёй філіялаў кафедр біяфака.

/Наш кар./.

## ВЫНІКІ НЕ СУЦЯШАЛЬНЫЯ

Пасля 14 мая, бадай, больш за ўсё размова ідзе аб выніках выбараў у Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь і рэферэндуму. Адразу ж адзначым: для калектыву нашага універсітэта нічога прыемнага яны не прынеслі. Нікому з пяці кандыдатаў у дэпутаты не ўдалося пераадолець першы рубеж барацьбы за месца ў вышэйшым органе заканадаўчай улады.

Нечаканасцю для многіх з нас закончыліся выбары па Гомельскай-Цэнтральнай выбарчай акрузе №86. Тут кандыдатамі ў дэпутаты былі зарэгістраваны прарэктар па вучэбнай рабоце ГДУ М.М.Воінаў, дацэнт кафедры тэорыі і методыкі фізічнай культуры У.М.Старчанка і дацэнт кафедры рускага, агульнага і славянскага мовазнаўства А.Ф.Рогалеў. Яны набралі адпаведна 1030, 1019 і 883 галасы з 13199 чалавек, прыняўшых удзел у галасаванні пры 24009 занесеных у спісы выбаршчыкаў. Большую колькасць галасоў -- 2303 -- набраў дырэктар Інстытута лесу АНБ В.А.Іпацьеў. Другім аказаўся юрыст прафсаюзнага банку Р.Ф.Фраловіч -- 1299 галасоў. Яны і выйшлі ў наступны тур галасавання, станоўчыя вынікі якога пад вялікім сумненнем. Справа ў тым, што выбаршчыкі проста здзіўляюць сваёй пасіўнасцю. У прыватнасці, у першым туры галасавання па выбарчаму ўчастку №22, што размяшчаўся ў вучэбным корпусе №2 нашага універсітэта, прыняло ўдзел нямногім больш за 40% выбаршчыкаў. Пераважную ж большасць з іх павінны былі скласці студэнты, выкладчыкі і супрацоўнікі ГДУ.

Вывады рабіце самі...



На здымку: упершыню галасуе студэнт факультэта фізічнай культуры А. КІЛЬЧЭЎСКІ.

Фота У.Чысціка.

## ВЯРНУЛІСЯ З ІТАЛІІ

Шмат адрасоў супрацоўніцтва з краінамі далёкага замежжа існуе ў нашага універсітэта. Новы з іх -- Італія, і, у прыватнасці, г.Піза, яго універсітэт, з якім, дзякуючы сумеснай беларуска-італьянскай праграме па стварэнню ў Гомельскай вобласці псіхалагічнай службы, у апошні час наладжваецца самая цесная сувязь. Як вядома, у нас вядзецца ўжо падрыхтоўка кадраў псіхолагаў з ліку студэнтаў педагагічных спецыяльнасцей, і лекцыі для іх чытае прафесар Пізанскага універсітэта Гаэтана Барлета.

У сярэдзіне мая дэлегацыя Гомельшчыны, у якую ўваходзілі кіруючыя, навуковыя, медыцынскія работнікі, у рамках праграмы супрацоўніцтва з італьянскімі псіхолагамі наведала гэтую краіну. У складзе дэлегацыі былі рэктар нашага універсітэта член-карэспандэнт АНБ прафесар Л.А.Шамяткоў і загадчык кафедры псіхалогіі і падрыхтоўкі да вучобы ў ВНУ А.А.Лытко. Яны разам з вучонымі гарадоў Рым, Піза, Лука, Фларэнцыя прынялі ўдзел у канферэнцыі псіхолагаў па тэорыі Л.С.Выгоцкага. Рэктар расказаў на ёй, як вядзецца падрыхтоўка кадраў псіхолагаў у ГДУ, А.А.Лытко выступіў з навуковым дакладам.

У праграме візіту гомельскай дэлегацыі было таксама наведванне НДІ нейрапсіхіятрыі і псіхапедагогікі /г.Піза/, падрабязнае знаёмства з яго універсітэтам, візіт у мэрыю, дзе ёй быў аказаны цёплы прыём. А ў оперным тэатры спецыяльна для гасцей быў дадзены канцэрт.

Паездка да італьянскіх калег, абмеркаванне далейшых шляхоў цеснага супрацоўніцтва па падрыхтоўцы кваліфікаваных кадраў псіхолагаў для нашага чарнобыльскага рэгіёна засведчыла: у выкананні беларуска-італьянскай праграмы зацікаўлены абодва бакі, і яны будуць імкнуцца да ўзаемаразумення на карысць справе. У хуткім часе чакаецца візіт да нас першага прарэктара Пізанскага універсітэта.

Поўнасцю прафінансаваў паездку ў Італію прымаючы бок -- Нацыянальная Асацыяцыя Сацыяльнай Дапамогі насельніцтву -- "АНПАС".

Т.НІКАЛАЕВА.

## ВІНШУЕМ !

*Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты фізічнага факультэта горача віншуюць дацэнта кафедры агульнай фізікі* ***ПІНЧУКА Вячаслава Рыгоравіча*** *з прысуджэннем яму Калегіяй БелВАКа вучонай ступені доктара тэхнічных навук.*

* * *

*Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты матэматычнага факультэта горача віншуюць старшага выкладчыка кафедры матэматычных праблем кіравання* ***ДАЛІНСКАГА Міхаіла Сямёнавіча*** */навуковы кіраўнік -- прафесар І.В.Максімей/ з паспяховай абаронай дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата тэхнічных навук.*

# ЛАЎРЭАТЫ НАВУКОВЫХ СКАРЫНАЎСКІХ ЧЫТАННЯЎ 1995 ГОДА





Па ўзгадненню конкурснай камісіі з Саветам універсітэта пераможцамі конкурсу на лепшую навукова-даследчую работу і лаўрэатамі Скарынаўскіх навуковых чытанняў 1995 года сталі:

**БОБРЫК Уладзімір Андрэевіч,** дацэнт кафедры беларускай мовы, кандыдат філалагічных навук за цыкл прац "Купала ў пошуках вызначэння беларускай моўнай асновы".

Мэтай работы з"яўлялася вывучэнне асаблівасцей мовы твораў Янкі Купалы. Асноўныя вынікі прадстаўлены ў шэрагу друкаваных прац.

Аўтарам даследаваны некалькі тыпаў дыялектызмаў, якія Янка Купала выкарыстоўваў толькі пры неабходнасці, адбіраючы з народнай мовы ўсё лепшае і каштоўнае і творча апрацаваўшы, уводзіў у літаратурны ўжытак. На аснове літаратурных лексічных адзінак і малаўжывальных суфіксаў, зазначае аўтар, Я.Купала па аналогіі народных слоў ствараў індывідуальныя ўтварэнні, якія таксама з"яўляюцца каштоўным матэрыялам у вывучэнні мовы паэта і яго ролі ў развіцці сучаснай літаратурнай мовы.

**КУРЫЛКІНА Святлана Мікалаеўна,** дацэнт кафедры фізічнай метралогіі, кандыдат фізіка-матэматычных навук за цыкл работ "Распаўсюджанне і акустааптычнае пераўтварэнне хваляў у крышталях пры наяўнасці гіратрапіі і электраіндуцыраванай анізатрапіі".

Прадстаўленае на конкурс даследаванне ўключае вынікі, апублікаваныя ў 21 рабоце ў розных выданнях СНД і за мяжой. Мэта работы -- тэарэтычнае даследаванне асаблівасцей распаўсюджвання і акустааптычнага пераўтварэння хваляў у крышталях пры наяўнасці складанай анізатрапіі і гіратрапіі.

◆◆◆

Скарынаўскія навуковыя чытанні адбудуцца на пасяджэнні Савета універсітэта 25 мая. Іх лаўрэатам будуць уручаны дыпломы і грашовыя прэміі.

**В.СКРЭЖЭНДЗЕЎСКАЯ, вядучы інжынер службы НТІ.**

## НА МІЖНАРОДНЫМ СЕМІНАРЫ

На базе Дома вучоных Польскай Акадэміі навук праходзіў ІІ польска-украінска-беларускі семінар па даследаванню кампазіцыйных матэрыялаў і керамікі. Ён працягваўся тры дні і ў яго рабоце ўдзельнічалі таксама вучоныя з некаторых іншых краін, у тым ліку і Расіі. Наш універсітэт на ім прадстаўлялі прарэктар па навуковай рабоце прафесар А.М.Сердзюкоў і вядучы спецыяліст, кіраўнік лабараторыі фотаакустычнай спектраскапіі Г.С.Міцюрыч. Першы з іх выступіў з дакладам "Лазернае кіруемае тэрмарасколванне сцёклаў і керамікі", другі -- з дакладам "Фотаакустычнае пераўтварэнне магнітнаактыўных слаістых структур". Абодва даклады былі з зацікаўленасцю выслуханы ўдзельнікамі семінара.

# ГОСЦІ З ЗША

На філалагічным факультэце адбылася сустрэча з дырэктарам Беларускага інстытута навукі і мастацтва ў ЗША Вітаўтам Кіпелем і супрацоўніцай славянскага і балтыйскага аддзела Нью-Йоркскай Публічнай бібліятэкі Зорай Кіпель. Госці расказалі студэнтам і выкладчыкам аб сваёй працы на ніве беларушчыны. З цікавасцю прысутныя пачулі, як беларусы за мяжой шануюць сваю мову, гісторыю, культуру, захоўваюць нацыянальныя традыцыі. Дарэчы, Вітаўт Кіпель з"яўляецца аўтарам кнігі "Беларусы ў ЗША", якая выдадзена ў нас. Замежныя навукоўцы мяркуюць аказаць дапамогу ў забеспячэнні навуковай літаратурай як на беларускай, так і англійскай мове музея-лабараторыі Францыска Скарыны, а таксама універсітэцкай бібліятэкі. Студэнты і выкладчыкі задавалі разнастайныя пытанні, што датычыліся жыцця і дзейнасці нашай эміграцыі.



Фота У.Чысціка.

Госці агледзелі выставу ручнікоў, сурвэтак, абрусоў, якая была арганізавана кафедрай беларускай мовы, пазнаёміліся з работай навукова-даследчай лабараторыі фальклору пры кафедры беларускай літаратуры, пабывалі яны і ў музеі-лабараторыі Ф.Скарыны, а таксама ў абласным краязнаўчым музеі, зрабілі экскурсію ў Веткаўскі музей народнай творчасці, в.Неглюбка, якая славіцца далёка за межамі Беларусі сваімі ручнікамі.

На памяць аб сустрэчы выкладчыкі факультэта падаравалі гасцям некаторыя свае навуковыя працы. Трэба спадзявацца, што такое супрацоўніцтва прынясе добры плён і агульную карысць.

**Л.КУЗЬМІЧ, намеснік дэкана філалагічнага факультэта па выхаваўчай рабоце.**



**ЗАЦВЕРДЖАНА пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 14 ліпеня 1993 г. № 466**

# З ПАЛАЖЭННЯ аб прысваенні вучоных званняў у Рэспубліцы Беларусь

Патрабаванні да саіскальнікаў вучоных званняў

6. **Вучонае званне дацэнта** прысвойваецца:

6.1. кандыдатам і дактарам навук, выбраным па конкурсу і назначаным на пасады дацэнта, загадчыка кафедры, дэкана факультэта, рэктара (прарэктара) ВНУ, дырэктара (намесніка дырэктара) ІПК і прыраўненых да іх навучальных устаноў, пасля 1 года паспяховай працы на гэтых пасадах, якія маюць:

стаж педагагічнай працы ў ВНУ не менш за 3 гады;

друкаваныя навуковыя і вучэбна-метадычныя работы, у тым ліку апублікаваныя пасля абароны дысертацыі, што выкарыстоўваюцца ў педагагічнай практыцы;

6.2 кандыдатам і дактарам навук, якія працуюць у навуковых установах Акадэміі навук Беларусі, навукова-даследчых інстытутах і прыраўненых да іх арганізацыях і маюць:

стаж навуковай і навукова-педагагічнай дзейнасці не менш за 3 гады, падрыхтавалі не менш 3 кандыдатаў навук;

друкаваныя навуковыя і вучэбна-метадычныя работы, у тым ліку апублікаваныя пасля абароны дысертацыі, што выкарыстоўваюцца ў навукова-педагагічнай практыцы.

7. У парадку выключэння вучонае званне дацэнта можа быць прысвоена наступным асобам, якія не маюць навуковай ступені:

7.1. навукова-педагагічным работнікам, выбраным па конкурсу і назначаным на пасады дацэнта, загадчыка кафедры, дэкана факультэта, рэктара (прарэктара) ВНУ, дырэктара (намесніка дырэктара) ІПК і прыраўненых да іх навучальных устаноў, пасля 3 гадоў паспяховай працы на гэтых пасадах, якія маюць:

стаж педагагічнай працы ў ВНУ не менш за 10 гадоў;

друкаваныя навуковыя і вучэбна-метадычныя работы, што выкарыстоўваюцца ў педагагічнай практыцы;

7.2. высокакваліфікаваным спецыялістам народнай гаспадаркі, выбраным па конкурсу і назначаным на пасады дацэнта, загадчыка кафедры, дэкана факультэта, рэктара (прарэктара) ВНУ, дырэктара (намесніка дырэктара) ІПК і прыраўненых да іх навучальных устаноў, пасля 3 гадоў паспяховай працы на гэтых пасадах, якія маюць:

стаж педагагічнай працы ў ВНУ не менш за 5 гадоў;

стаж вытворчай дзейнасці ў адпаведнай галіне не менш за 10 гадоў;

друкаваныя навуковыя і вучэбна-метадычныя работы, што выкарыстоўваюцца ў педагагічнай практыцы;

7. дзеячам культуры, мастацтва, архітэктуры, работнікам фізічнай культуры, выбраным па конкурсу і назначаным на пасаду дацэнта, загадчыка кафедры, дэкана факультэта, рэктара (прарэктара) ВНУ, дырэктара (намесніка дырэктара) ІПК і прыраўненых да іх навучальных устаноў, пасля 1 года паспяховай працы на гэтых пасадах, якія маюць:

стаж педагагічнай працы ў ВНУ не менш за 3 гады;

значныя асабістыя творчыя (спартыўныя) дасягненні.

8. **Вучонае званне прафесара** прысвойваецца:

8.1. дактарам навук, выбраным па конкурсу і назначаным на пасады прафесара, загадчыка кафедры, дэкана факультэта, рэктара(прарэктара) ВНУ, дырэктара (намесніка дырэктара) ІПК і прыраўненых да іх навучальных устаноў, пасля 1 года паспяхо-

**(Заканчэнне на 4-й стар.)**

**Даследуюць гісторыкі**

# ГОМЕЛЬСКАЯ КАФЛЯ: ПОШУКІ, ЗНАХОДКІ, ВЫНІКІ

Кафля /ад ням. kachel - - кухонны посуд/, керамічны выраб для абліцоўкі і дэкаратыўнага аздаблення печаў.

Гісторыя беларускага рамяства змяшчае ў сабе шэраг цікавых, але, на жаль, недастаткова вывучаных старонак, адной з якіх і з"яўляецца кафлярства. Кафля, шырокае распаўсюджанне якой прыпадае на XVII-XVIII ст.ст., у значнай ступені адлюстроўвала духоўна-культурнае жыццё грамадства ўсяго перыяду яе распаўсюджання.

Свой пачатак кафляная вытворчасць бярэ з Нямеччыны, дзе ў пачатку XIII ст. з"яўляецца т.з. "гаршчковая" кафля, якая мела цыліндрычнае тулава і купала-зводчатае дно, на манер гаршчкоў. Адсюль і назва -- гаршчковая. Выкарыстоўваліся яны ў якасці цеплаправодных каналаў.

У пачатку XIV ст. кафля пранікае на тэрыторыю Беларусі. Аднак росквіт беларускага кафлярства пачынаецца толькі з XVI ст., з распаўсюджання т.з. каробчатых кафляў, якія мелі выгляд каробкі і складаліся з дзвюх частак: вонкавай пласціны, упрыгожанай дэкаратыўным рэльефам -- дэкорам, і румпы -- задняй часткі кафляў, якой яна мацавалася ў печы.

У XVI-XVII ст.ст. ужо немагчыма ўявіць жылую пабудову без кафлянай печы, якая робіцца, бадай, галоўным прадметам інтэр"ераў.

Сёлета было праведзена першае даследаванне гомельскай кафлі XVI-XVII ст.ст. Як вядома, Гомель /Гомій/ у тыя часы ўваходзіў у склад Вялікага княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай, з"яўляўся значным умацаваным цэнтрам на ўсходніх межах дзяржавы. Першае даследаванне гістарычнай часткі горада адбылося ў 1975 г. археалагічным атрадам Інстытута гісторыі пад кіраўніцтвам М.А.Ткачова, аднак ніякіх матэрыялаў па гісторыі гомельскіх кафляў на той час не было знойдзена. Першыя знаходкі кафляў былі зроблены ў 1986 г. Раскопкі праводзіліся на тэрыторыі кінатэатра імя Ісачанкі і закончыліся ў 1987 г. Гэтыя даследаванні дазволілі адкрыць сляды драўляных пабудоў з рэшткамі кафляных печаў. Былі знойдзены рэшткі "гаршчковых" кафляў XV-XVI ст.ст., а таксама каробчатых кафляў з раслінным і геаметрычным арнаментам. Асаблівую цікавасць уяўляе знаходка мураўлёнай кафлі XVI-XVII ст.ст. з выявай чалавека ў багатай вопратцы.

Летам мінулага года гомельскі археалагічны атрад ГДУ імя Ф.Скарыны пад кіраўніцтвам А.А.Макушнікава пачаў даследаванне тэрыторыі Сабора Пятра і Паўла. Тут былі адкрыты рэшткі жылой пабудовы XVI-XVII ст.ст., магчыма, загінуўшай пад час войнаў сярэдзіны XVII ст. Жылы гомельскі дом змяшчаў у сабе раскошную кафляную печ, якая пасля разбурэння будынка правалілася ў падвал. Магчыма, дом належаў святару, аб чым сведчаць знаходкі царкоўнага падсвечніка і бронзавай чашы з рэшткамі акантоўкі срэбрам. Знойдзеныя рэшткі кафляў дазваляюць правесці рэканструкцыю печы. Гомельская печ складалася з двух пячных кафляных набораў, што для разглядаемага перыяду было звычайным. Тэракотавая кафля геаметрычнага арнаменту перамяжоўвалася з

**(Заканчэнне на 4-й стар.)**

(Заканчэнне.
Пачатак на 3-й стар.)

вай працы на гэтых пасадах, якія маюць:

стаж педагагічнай працы ў ВНУ не менш за 5 гадоў;

значныя друкаваныя навуковыя і вучэбна-метадычныя работы, у тым ліку апублікаваныя пасля абароны дысертацыі, што выкарыстоўваюцца ў педагагічнай практыцы (падручнікі, вучэбныя дапаможнікі, курсы лекцый, манаграфіі), і вядуць падрыхтоўку навукова-педагагічных і навуковых кадраў (пры наяўнасці аспірантуры па адпаведнай спецыяльнасці);

8.2. дактарам навук, якія працуюць у навуковых установах Акадэміі навук Беларусі, у навукова-даследчых інстытутах і прыраўнаваных да іх арганізацыях і якія:

ажыццяўляюць навуковую і навукова-педагагічную дзейнасць на працягу 5 гадоў і болей;

падрыхтавалі не менш за 5 кандыдатаў навук;

маюць значныя навуковыя і вучэбна-метадычныя работы, у тым ліку апублікаваныя пасля абароны дысертацыі, што выкарыстоўваюцца ў навукова-педагагічнай практыцы.

9. У парадку выключэння вучонае званне прафесара можа быць прысвоена:

9.1. кандыдатам навук, выбраным па конкурсу і назначаным на пасады прафесара, загадчыка кафедры, дэкана факультэта, рэктара (прарэктара) ВНУ, дырэктара (намесніка дырэктара) ІПК і прыраўненых да іх навучальных устаноў, пасля 3 гадоў паспяховай працы на гэтых пасадах, якія маюць:

стаж педагагічнай працы ў ВНУ не менш за 10 гадоў;

значныя друкаваныя навуковыя і вучэбна-метадычныя работы, у тым ліку апублікаваныя пасля абароны дысертацыі, што выкарыстоўваюцца ў педагагічнай практыцы (аднаасобныя падручнікі, вучэбныя дапаможнікі або сааўтарства не менш чым у трох падручніках, вучэбных дапаможніках з грыфам міністэрства, курсы лекцый, манаграфіі), і вядуць падрыхтоўку навукова-педагагічных кадраў (маюць не менш чым двух вучняў, якім прысвоена вучоная ступень, пры наяўнасці аспірантуры па адпаведнай спецыяльнасці);

вучонае званне дацэнта;

9.2. дзеячам культуры, мастацтва, архітэктуры, работнікам фізічнай культуры, выбраным па конкурсу і назначаным на пасады прафесара, загадчыка кафедры, дэкана факультэта, рэктара (прарэктара) ВНУ, дырэктара (намесніка дырэктара) ІПК і прыраўнаваных да іх навучальных устаноў, пасля 3 гадоў паспяховай працы на гэтых пасадах, якія маюць:

стаж педагагічнай працы ў ВНУ не менш за 5 гадоў;

вучонае званне дацэнта, атрыманае не менш чым за пяць гадоў да прадстаўлення да вучонага звання прафесара;

значныя асабістыя творчыя (спартыўныя дасягненні, ганаровыя званні і іншыя заслугі, манаграфіі, падручнікі, вучэбныя дапаможнікі, навучальныя праграмы, курсы лекцый, зборнікі твораў, фондавыя аўдыё- і відыёзапісы, грамзапісы, кампактдыскі;

вучняў, якія дасягнулі вялікіх творчых (спартыўных) поспехаў, -- заслужаных артыстаў, заслужаных дзеячаў навукі, заслужаных дзеячаў мастацтваў, заслужаных работнікаў культуры, заслужаных работнікаў фізічнай культуры і спорту, лаўрэатаў дзяржаўных прэмій, лаўрэатаў і дыпламантаў міжнародных конкурсаў, чэмпіёнаў свету, прызёраў алімпійскіх гульняў, майстроў спорту міжнароднага класа, а таксама падрыхтавалі не менш чым двух кандыдатаў навук або двух асістэнтаў-стажораў (пры наяўнасці аспірантуры або асістэнтуры па адпаведнай спецыяльнасці);

9.3. буйным спецыялістам народнай гаспадаркі -- кандыдатам навук, выбраным па конкурсу на пасады прафесара, загадчыка кафедры, дэкана факультэта, або назначаным на пасады рэктара (прарэктара) ВНУ, дырэктара (намесніка дырэктара) ІПК і прыраўнаваных да іх навучальных устаноў, пасля 3 гадоў паспяховай працы на гэтых пасадах, якія маюць:

стаж педагагічнай працы ў ВНУ не менш за 5 гадоў;

вучонае званне дацэнта, атрыманае не менш чым за 5 гадоў да прадстаўлення да вучонага звання прафесара;

значныя друкаваныя навуковыя і вучэбна-метадычныя работы, што выкарыстоўваюцца ў педагагічнай практыцы.

9.4. народным артыстам, народным мастакам, народным настаўнікам, народным пісьменнікам, народным паэтам, народным урачам, выбраным па конкурсу на пасады прафесара, загадчыка кафедры, дэкана факультэта або назначаным на пасады рэктара (прарэктара) ВНУ, дырэктара (намесніка дырэктара) ІПК і прыраўнаваных да іх навучальных устаноў, пасля 3 гадоў паспяховай працы на гэтых пасадах, якія маюць:

стаж педагагічнай працы ў ВНУ не менш за 10 гадоў;

вучонае званне дацэнта, атрыманае не менш чым за пяць гадоў да прадстаўлення да вучонага звання прафесара.

## ГОМЕЛЬСКАЯ КАФЛЯ: ПОШУКІ, ЗНАХОДКІ, ВЫНІКІ

(Заканчэнне.
Пачатак на 3-й стар.)

мураўлёнай раслиннага і лускавага арнаменту. Верх печы ўпрыгожваўся каронкамі. Печ магла быць шматяруснай, так як былі знойдзены фрагменты перамычак. На кафлях сустракаюцца сляды пабелкі. Напэўна, печ служыла досыць працяглы час, з цягам якога кафля згубіла першапачатковы стан.

У раскопе былі знойдзены фрагменты кафлі XVII ст. з геаметрычным, раслінна-геаметрычным і геральдычным арнаментам. Фрагмент уяўляе сабой левую, ніжнюю частку кафлі з выявай геральдычнага арла. Падобныя кафлі былі знойдзены пад час даследаванняў Заслаўскага замка. Нярэдка на грудзях арла змяшчаўся геральдычны шчыт з гербам горада. На жаль, прадстаўлены фрагмент немагчыма рэканструяваць, што ў адваротным выпадку магло праліць святло на праблему пошуку сапраўднага герба г.Гомеля часу Вялікага княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай.

У цэлым даследаванне гомельскіх кафляў не завершана і патрабуе асобнай працы з матэрыяламі раскопак 1986-1987 г.г. і іх супастаўлення з ужо вывучаным матэрыялам.

**Д.ШКУДУН, Р.КАБАШНІКАЎ, студэнты 2 курса гісторыка-юрыдычнага факультэта.**

*ТРАДЫЦЫІ*

## У "ДНІ БІЁЛАГА"



Праграма традыцыйных дзён была насычанай: дзелавыя, сур"ёзныя мерапрыемствы перамяжаліся вясёлымі, забаўляльнымі.

Адкрылі факультэцкае свята першакурснікі. Нямала было жадаючых убачыць творы кулінарнага майстэрства студэнтаў і выкладчыкаў біяфака. Першае месца журы прысудзіла выкладчыцы кафедры хіміі Л.А.Бяляевай за прыгожы і смачны торт. А затым адбыўся канцэрт студэнцкай самадзейнасці. Вялікую цікавасць выклікала таксама творчая выстава, на якой экспанаваліся работы, выкананыя ўмелымі рукамі студэнтаў. Лепшымі прызнаны аўтары В.Шамоніна, А.Трухава, А.Карнеева, Т.Прыходзька і інш.

Шматлюдна было каля вучэбнага корпуса N 1, дзе выкладчыцай Т.В.Макаранка была арганізавана выстаўка парод сабак. Тым, хто любіць гэтых разумных і адданых чалавеку істот, было надзвычай цікава паназіраць, на што здольныя "браты нашы меншыя".

На сваю навуковую канферэнцыю яе ўдзельнікі-студэнты запрасілі навуковых супрацоўнікаў філіяла НДІ радыяцыйнай медыцыны В.І.Бронскага /**на здымку**/ і А.Н.Асіпенку, якія расказалі аб чарнобыльскіх праблемах і шляхах іх вырашэння.



На студэнцкай канферэнцыі. Фота У.Чысціка.

Завіталі ў госці на свой родны факультэт і яго выпускнікі загадчык аддзела адукацыі Савецкага раёна г.Гомеля С.І.Парошын, дырэктар СШ N8 С.А.Рыдны, завуч гэтай жа школы Т.І.Кліменка, выкладчык хіміі СШ N15 П.У.Уласаў -- пераможца гарадскога конкурсу, лаўрэат абласнога конкурсу "Настаўнік года". Яны ўспаміналі аб сваіх студэнцкіх гадах, вялі размову аб надзёных праблемах школьнай адукацыі.

У заключэнне праграмы "Дзён біёлага" адбыўся канцэрт мастацкай самадзейнасці.

Актыўна ўдзельнічалі ў падрыхтоўцы і правядзенні свята біёлагаў кураторы акадэмічных груп В.Р.Свірыдзенка, Т.В.Макаранка, Н.І.Рэзнікава, С.У.Аўсеенка, студэнты В.Дарошчанка і С.Ланько.

**М. ДАЙНЭКА, нам.дэкана біяфака па выхаваўчай рабоце.**



ЛІДЭР

Гэты расказ пра цудоўнага меладыста, чыё імя да нядаўняга часу было практычна невядома нават самым дасведчаным меламанам у нас у краіне. Невядома, нягледзячы на тое, што мелодыі яго заўсёды гучалі ў эфіры, выкарыстоўваліся на самых розных застаўках і ў якасці фонавай музыкі... Ды і зараз аб ім вядома не так ужо шмат. Наша прэса практычна не друкуе матэрыялаў ні аб ім, ні аб яго творчасці. Нарэшце, сёння мы пагаворым аб арыгінальным меладысце сучаснасці -- Крысе Ры.

## НЕРАЗУМНА ГАВАРЫЦЬ КАМУСЬЦІ "ДЗЯКУЙ"...

Спявак, кампазітар і выканаўца сваіх жа кампазіцый Крыс Ры нарадзіўся ў Англіі ў 1951 годзе. У дзяцінстве, як гэта часта бывае, бацькі аддалі свайго сына ў музычную школу па класу фартэпіяна, што спатрэбілася яму ў далейшым. Спачатку музыка не падабалася маленькаму Крысу. Але яго адносіны да яе рэзка змяніліся пасля таго, як аднойчы ён пачуў песні ў выкананні Джо Уолша. Музыка гэтага неардынарнага кампазітара настолькі ўразіла і спадабалася Крысу, што ён вырашыў паспрабаваць дасягнуць хаця б некаторых вышынь з тых, якіх дасягнуў яго кумір. Вынікам стала песня, у якой адлюстравалася юнацка-наіўнае імітаванне свайго куміра. Называлася гэта песня "Неразумна гаварыць камусьці "дзякуй". Яна стала своеасаблівым маніфестам непатрэбнасці імітавання для самога Крыса і ўсіх, хто любіў сваіх куміраў...

У 1976 годзе песня атрымала прызнанне як ў Амерыцы, так і ў роднай Англіі, што ўжо само па сабе было рэдкасцю і нечаканым прызнаннем маладога і нікому невядомага кампазітара-навічка. Аднак замацаваць поспех Крысу Ры не ўдалося -- у Англіі пераважаў агрэсіўны панк-рок, а мелодыі на фоне ўсіх гэтых афарбавана-узлахмачаных тыпаў выглядалі незваротна-састарэлым анахранізмам... Прайшло амаль тры гады з моманту выхаду ў свет першай песні і да моманту, пакуль Крысу Ры ўдалося запісаць першы доўгаіграючы дыск. У 1978 годзе выходзіць у свет пласцінка "Што б не здарылася", у якой Крыс Ры працягваў распрацоўку раней знойдзенай лірычнай тэматыкі. З гэтага часу пласцінкі Крыса Ры выходзяць практычна кожны год. Усе яны вытрыманы прыкладна ў аднолькавай выканаўчай і кампазіцыйнай манеры: прыемная мелодыя без усякага фарсіравання гуку, з арыгінальнай аранжыроўкай і вельмі простым і пранікнёным меладызмам у рытмічным будаванні. Сярод найбольш значных і лепшых, на думку музычных крытыкаў, можна назваць альбомы "Тэніс" (1980 г.), "Крыс Ры" (1982 г.), "Тэлеграфаваны на Месяц" (1984 г.) і альбом 1986 года "На беразе", выпусціць які згадзілася фірма "Мелодыя" у 1988 годзе. Ну што ж, для нашай краіны гэта не такі ўжо і вялікі тэрмін чакання для выхаду ў свет пласцінкі, якую палюбілі слухачы. А вось суграмадзяне Крыса Ры англічане з групы "Юрайе Хіп" чакалі гэтага з 1970-га па 1992 год...

І ўсё ж... Усё ж... Што б ні казалі, Крыс Ры адзін з арыгінальных і цікавых меладыстаў нашага часу, няхай і не заўсёды яго музыка рознапланавая і арыентавана толькі на аматараў традыцыйнага лірызму, падобная на тое, што ёсць у Пола Макартні, Стыва Уандэра і Леанарда Коэна, але нават быць пастаўленым у адзін рад з праслаўленымі лідэрамі меладычнага року 60-70-х гадоў -- ганарова. А Крыс Ры заслужыў гэта параўнанне. І яго апошнія дыскі "Дарога ў Пекла", "Аўберг" і дыск 1994 года "Эспрессо Лоджык", пацвярджаюць высокі ўзровень прафесіяналізму, арыгінальнасць аранжыровак і пранікнёны меладызм кампазіцый. Менавіта дзякуючы гэтым сваім якасцям Крыс Ры такі папулярны ў прыхільнікаў музыкі розных стыляў і жанраў, якія тым не менш разумеюць, што галоўнае -- гэта "фірменны" саунд і вернасць свайму творчаму крэда. Іменна ў гэтым -- заслуга Крыса Ры як музыканта і кампазітара.

**П.БЕСЯЦКІ, вядучы рубрыкі "Лідэр".**

## ЗНОЎ ЧАКАЕ ФРАНЦЫЯ

Народны фальклорна-харэаграфічны ансамбль "Радзімічы"



Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Францыска Скарыны зноў запрасіла наведаць з 1 па 15 ліпеня 1995 года Францыя. Беларускае нацыянальнае мастацтва ўбачаць жыхары Клермонт-Ферана, Ісуар'ена, а таксама Арлеана.

# НА ЛІТАРАТУРНАЙ ХВАЛІ



**Иван ХАРЛАМОВ**

## АСТРОЛОГ

Путь к свету,
Что у нас украден,
Ушел во тьму
Миров иных...
И ищешь ты,
На небо глядя,
Разгадку бед
И тайн земных.
Все ищешь
Рокового знака
Судьбы --
В явлении комет,
Удач --
В созвездье Зодиака,
Надежд --
В тумане Андромед.
Сулишь
Невидимое счастье,
Храня
От помыслов лихих...
И я хвалю
Твое участье
В тревогах
И в делах мирских.
Я знаю:
Есть у всех потреба
Зреть утешение вдали...
Но надо ль
Вглядываться в небо,
Коль гложет душу
Боль земли?

**Алексей Феськов, мастер спорта СССР.**

## "НА, СТАРТ!"

Нацелен в божий свет,
Зажат в руке из стали
Сигнальный пистолет...
И зрители привстали.
Секунда, может, две
И выстрел поразит
Сердца и мозг людей
И тех, кто побежит.
Кто меньше десяти
Отчаянных мгновений
Рассыпет на пути,
Как стометровый гений.
Кто больше десяти
Нелегких лет потратил
На то, чтобы взойти
На пьедестал собратьев.
Какой прекрасный миг
Застыл в глазах людей --
Здесь человек постиг
Величие идей.
Идеи быстроты,
Идеи красоты,
Бессмертия идей
Могущества людей.
Ты вспомнишь этот миг,
Как он в тебя проник...
Как многое постиг
Ты, человек, за миг!

## І ПАЭТ, І МАСТАК

Аляксандр Кузняцоў -- натура творчая, так бы мовіць, удвая. Ён не толькі піша вершы, але і малюе. Гэтая творчасць выклікаецца ўнутранай гармоніяй душы маладога чалавека, яго светаўспрыманнем, што дапамагае яму ў выбары тэм як для паэзіі, так і для жывапісу. Аляксандра цікавіць і хвалюе адзінства чалавека і прыроды, паводзіны людзей у экстрэмальных прыродных сітуацыях, вобразы мінулага.

Творчая натура юнака фарміравалася з самага дзяцінства ў сям"і. Яго бацька -- мастак і здолеў перадаць сваю любоў да свету цудоўнага дзецям. У доме Кузняцовых -- шмат разнастайнай літаратуры аб мастацтве.

Малюнкі Аляксандра шмат разоў экспанаваліся на розных выстаўках ва універсітэце. Гэтыя два, прадстаўленыя сёння на старонках нашай газеты, -- з серыі аб прыродзе і носяць назву "Зімовыя коні" і "Бэзавы ранак".

**Александр КУЗНЕЦОВ, студент 5 курса филологического факультета.**

### ГОРИТ ФОНАРЬ

Горит фонарь, и я горю,
Мы с ним как братья по огню,
Он для звезды, я -- для тебя,
У нас похожая судьба.

Он был зажжен рукой Луны,
Я был зажжен рукой весны...
Теперь друг другу мы верны
В час полуночной тишины...

Когда свет гаснет за окном,
Спокоен мой уснувший дом.
Нет света ярче и родней
для двух вещей, для двух
людей!

Что мы делили каждый день...
Я был убит, я был раздавлен...
За мной исчезла друга тень,
Я одиночеством отравлен.

В минуты тяжкой тишины
Я размышлял тогда о многом,
что мы друзей забыть вольны,
прося у них совсем немного...

◆◆◆

Ко мне друг в гости не спешил –
Я думал, он забыл дорогу,
Я думал, он всерьез решил
забыть и радость, и тревогу,

Ко мне друг в гости не спешит...
Я дверь открытую оставил.
Не существует для души
ни исключения, ни правил...



ЗІМОВЫЯ КОНІ.



БЭЗАВЫ РАНАК

**Владимир ИВАНОВ, студент 5-го курса геолого-географического факультета.**

◆◆◆

Мне хотелось, чтоб было утро,
Почему-то настала ночь.
Мне хотелось казаться мудрым,
Но все мысли летели прочь.
Мне хотелось всегда быть первым,
Почему-то вторым я был.
Натянулись как струны нервы
И теперь белый свет не мил.
Для меня не осталось места
Лишь на грешной этой земле.
Не с того я состряпан теста,
Чтоб в глаза мне смеялись все.
Надоело мне птицей в клетке
Свой недолгий век коротать,
Не могу соловьем петь на ветке,
Журавлем хочу в небе летать.



*Трагігумарэска*

# АЎЧЫНКАВАЯ СПРАВА

Люблю я, хлопцы, цікаўных людзей, якія слухаюць мяне дужа ўважліва. Ну дык слухайце старанна, бо расказваць я буду пра дарогу і пра тое, што на ёй часам адбываецца, як бы ты таго хацеў або не.

Надумаў я, гэта, па першых маразах пракінуцца па вёсках роднае Беларусі, каб прыкупіць такіх-сякіх аўчынак сыну на кажух. Хлопца быў час ужо жаніць, дык думаю, не лішне будзе парадаваць дзецюка, справіўшы яму гэткую адзежыну.

Надумана -- зроблена. І пачаў я збірацца ў дарогу. Спачатку гадзін шэсць /праўда, з перапынкамі/ праваляўся пад сваім чырвоным Чабурашкам/ гэта я так "Запарожац" заву/, што -- кольвеч памяніў, тое-сёе падцягнуў, давёў-такі да ладу, каб, крый божа, у дарозе штонебудзь не здарылася, бо "загараць" у такую халадэчу дзесьці сярод палёў асалоды малавата. Потым загадаў жонцы сваёй пацiху збірацца, каб раніцой, не дужа марудзячы, і выехаць.

Я, хлопцы, не ведаю, як там жанчына на караблі: можа яна і прыносіць няшчасці, а вось што датычыцца аўтамабіля /хай сабе і Чабурашкі/, то, на маю думку, тут жанчына -- гэта, можна сказаць, неад"емнае ўпрыгожанне, ну як усё роўна талісман які! А калі гэтая жанчына -- жонка, і займае яна пачэснае месца побач з табой, то тады, брат, ты можаш па праву любіць гэтае жыццё, а калі твая жонка яшчэ і кабета талковая, знаходлівая і вясёлая /як мая/, то ты -- наогул чалавек шчаслівы...

Дык вось: выбраліся мы з маёй вернай "дружынай", як хахлы кажуць, ранкам у дарогу, захапіўшы паболей грошай і ўзяўшы гасцінцаў сваім бацькам, бо вядома ж: калі едзеш па вёсках за аўчынкамі, то найперш да бацькоў у вёску завітай, бо там табе і параду добрую дадуць, і душа твая ля каранёў родных адпачне. А вёска нашых старых -- у Чэрыкаўскім раёне, дзе людзі дасюль у страшэннай радыяцыі жывуць...

Не буду хлусіць вам, усё добра справілі, за два дні тавару прыкупілі, у бацькавай лазні косці папарылі, вяртацца ў Гомель збіраемся, аж тэлефануе брат са Жлобіна ды кажа: "Заедзь ты, Сашка, да мяне, праведай", а то, маўляў, даўно не бачыліся... А пагэтаму вырулiў я на маскоўскую шашу, ды папёр на Слаўгарад, Доўск...Ледзь да Рагачова не даехаў, як з"яўляецца на дарозе, бы "з тумана выплывае", мажная постаць сержанта- "гаішніка". А я так думаю сабе: і да чаго, цікава, ён прычэпіцца? І ён-такі прычапіўся... Кажа: "Што вязеце?" Я хвацка, з усмешкай адказваю, як у галівудскіх фільмах: "Аўчынкі, гаспадзін сержант!" Але ён не адступаецца і просіць паказаць. Мне -- што? Я -- калі ласка! Але не такі просты быў той сержант, хлопцы мае! Адкрываю я шырокім жэстам вечка багажніка, а ён - - тыц туды дазіметр /адкуль і ўзяўся?!/, а на дазіметры ад тых аўчынак -- радыяцыя скача! Думаю: няўжо загадае аддаць дабро? Аж не, кажа, маўляў, вязі, дзядзька, назад ці скідай, але далей я цябе не пушчу. Хвіліну... не -- секунд пятнаццаць /але і гэта, як пішуць у кніжках, здалося мне вечнасцю/ з "варожых" бакоў панавала дрыготкае маўчанне, якое тактоўна перарвала мая мудрая "палавіна". "Таварыш міліцыянер", -- звярнулася яна да яго і зняла з сваёй галавы норкавую шапку. -- "А памерайцека етую радзіяцыю ў маёй шапцы", -- і працягнула яму "норку". Сержант ветліва замерыў... і ў шапцы маёй любай Ганны радыяцыі было болей, чым у тых чэрыкаўскіх аўчынках /!/. Я пачаў было злаваць на неразумную жонку, бо падумаць толькі: зараз зусім нас распране паставы з-за гэтай, ліха на яе, радыяцыі! "Во", -- думаю, -- "Паслецтвія" чарнобыльскай бяды, і тут ад іх паратунку няма!"

А ў гэты час сержант вярнуў "норку" жонцы і з цікавасцю зняў сваю аблавушку з какардай. І -- дзіва! Для радыяцыі, якая, відаць, да краёў напаўняла міліцэйскую шапку, было мала месца ў дазіметры: ён "зашкаліваў"!

Я з павагай паглядзеў на Ганну і ў думках яе пацалаваў: здагадалася, ластаўка мая, ды і наогул пашанцавала нядрэнна! Сержант жа быў вельмі здзіўлены такім становішчам, але таксама хлопец быў свой, гумар разумеў і знаходлівасць людзей, па ўсім відаць, цаніў. Схаваў ён свой дазіметр падалей, пачырванеў крыху /можа і ад марозу/, але чотка казырнуў і пажадаў шчаслівай дарогі...

З таго часу, хлопцы, я заўсёды, як куды еду далёка, дык на пярэдняе сядло Чабурашкі саджу побач сваю любімую Ганульку.

А кажух? Кажух выйшаў слаўны, сам яго нашу: не хоча сын жаніцца!

**Рыгор СЕРЫКАЎ,**
**студэнт 5 курса**
**філалагічнага факультэта.**

**Алла БРЕДИХИНА,**
**студентка 3-го курса заочного факультета**

## МЛЕЧНЫЙ ПУТЬ

*Кудесница-ночь взмахнула крылом.*
*Светом наполнились улицы.*
*Город забылся, заснул тяжким сном,*
*Лишь месяц на небе хмурится.*

*Печально льют свет сторожа-фонари,*
*Страдающие бессонницей,*
*Целую ночь напролет до зари,*
*Месяц за тучи хоронится.*

*В сонме сияющих маленьких звезд,*
*По бархату неба разбросанных,*
*Белеет дорога былых моих грез,*
*Дорога мечтаний непрошенных.*

*Ребенком хотелось по ней пробежать,*
*Звезд лишь касаясь ногами,*
*На месяц присесть и от счастья дрожать,*
*Сознавать, что ты рядом с богами.*

*Позже хотелось руками взмахнуть,*
*До звезд долететь, между ними парить,*
*Узнать, наконец, где кончается Путь,*
*И лучшие чувства ему подарить.*

*Теперь не хочу я шагать и летать,*
*Я жажду средь звезд оставаться навек.*
*Мне хочется звездочкой маленькой стать,*
*Светить в темноте тебе, Человек!*

# "СТУДЭНЦКАЯ ВЯСНА" У ВІЦЕБСКУ

З 5 па 9 мая ў г.Віцебску праходзіў III Рэспубліканскі фестываль моладзі і студэнтаў "Студэнцкая вясна". Прыемна, што ўжо трэці раз у гэтым фестывалі прымаюць удзел прадстаўнікі нашага універсітэта.

Аднак, на жаль, у сувязі з фінансавымі цяжкасцямі сёлета ў горад над Дзвіной змаглі паехаць удзельнікі толькі аднаго творчага калектыву ГДУ -- СТЭМа, а таксама мастацкі кіраўнік культурнага цэнтра М.Шырынкіна, кіраўнік тэатра "Люстэрка" У.Ушакоў і студэнты -- члены культурна-масавай камісіі прафкома І.Прысяжны, А.Кузьмянкова, Ж.Біран.

У праграму фестывалю ўваходзіла навукова-практычная канферэнцыя "Моладзь і дзяржава", у рабоце якой прынялі ўдзел прадстаўнікі Міністэрства адукацыі і навукі, Камітэта па справах моладзі, выкладчыкі і студэнты ВНУ рэспублікі.

Але самай яркай і памятнай была, бясспрэчна, музычна-мастацкая частка фестывалю. Яго адкрыццё, штодзённыя канцэрты, начныя дыскатэкі ў Палацы культуры і на плошчы горада надоўга запамятаюцца ўсім удзельнікам свята маладосці. А закрыццё, якое праходзіла 9 мая, вылілася ў вялікае свята, на якім аб"ядналіся два пакаленні -- ветэраны і студэнты. Громам салюта і маляўнічым феерверкам завяршыўся фестываль, але нікому не хацелася ад"язджаць дамоў. Многія абменьваліся адрасамі, спявалі і танцавалі да самай раніцы.

Хочацца спадзявацца, што і ў наступным фестывалі моладзі, які будзе праходзіць у г.Віцебску ў 1997 годзе, прымуць удзел студэнты нашага універсітэта.

**Я.ПЫШНЯК,**
**нам. старшыні прафкома студэнтаў, удзельнік фестывалю.**



МАЙСКІ ВЯНОК

## *Студэнцкі капуснік*

### ФРАЗЫ

Колькі ўпэўненасці надае чалавеку думка: "Была не была!"

◆◆◆

Самы просты спосаб не ведаць сабе роўных -- не знаёміцца з імі.

◆◆◆

Каб смяяцца апошнім, неабходна ўменне выбраць момант, калі пачаць смяяцца.

◆◆◆

Заўсёды трымайся ў баку і тлумачы ўсё гэта тым, што з боку больш бачна.

◆◆◆

Дэкан вырашаў усе праблемы метадам выключэння.

Колькі людзей пакутуе ад адзіноты, таму што яна ў іх гордая!

◆◆◆

Для таго, каб расстацца ворагамі, часам дастаткова даць сяброўскую параду.

◆◆◆

Было б нядрэнна, калі б там, дзе ракі зімуюць, пабудавалі піўны бар.

### ТЛУМАЧАЛЬНЫ СЛОЎНІК

- Поп-музыка -- царкоўныя спевы.
- Не даваць праходу -- служыць у пагранічных войсках.
- Безабаронны -- той, хто не мае вучонай ступені.

### Школа жыцця або карысць геаграфіі

Дзяўчына кажа сваёй сяброўцы пра свайго хлопца:
-- Некалі ён быў для мяне цэлым светам, але з цягам часу я крыху падвучылася геаграфіі...

**ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ імя Ф.СКАРЫНЫ**

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад па кафедрах:
-- матэматычнага аналізу -- асістэнта;
-- тэорыі і метадыкі фізічнай культуры -- ст. выкладчыка;
-- лёгкай атлетыкі і лыжнага спорту -- ст. выкладчыка;
-- фізвыхавання -- выкладчыка.

Тэрмін падачы заяў -- не пазней 1 месяца з дня апублікавання паведамлення.

Заявы накіроўваць на адрас: 246699 г.Гомель, вул.Савецкая, 104.

**РЭКТАРАТ**

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат біялагічнага факультэта, калектыў кафедры хіміі выказваюць глыбокае спачуванне дацэнту **СВІРЫДЗЕНКА Валянціне Рыгораўне** з выпадку напаткаўшага яе гора -- смерці **МАЦІ**.

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат геолага-геаграфічнага факультэта, кафедра інжынернай геалогіі і гідрагеалогіі выказваюць глыбокае спачуванне дацэнту **ЖОГЛУ Васілю Гаўрылавічу** з выпадку напаткаўшага яго гора -- смерці **МАЦІ** і старшаму выкладчыку кафедры геафізікі **ВЯРУЦІНУ Міхаілу Рыгоравічу** з выпадку напаткаўшага яго гора -- смерці **БАЦЬКІ**.

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК -- Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 1-18, тэл. 57-43-21.

Рэгістрацыйны № 221

Спонсары газеты -- НВП "Сучасныя тэхналогіі", прафком студэнтаў.

Газета набрана і зверстана на настольна-выдавецкім комплексе ІВЦ ГДУ, аддрукавана на Гомельскай фабрыцы "Палесдрук", г.Гомель, вул.Савецкая, 1.

За няякасны набор, вёрстку і памылкі фабрыка "Палесдрук" адказнасці не нясе.

Рэдактар Ул.П. БАЛОГА

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.500 экз.
Заказ 271.
Падпісана да друку 18.05.95.